УДК 947.6 «1917»

М.Я. Сяменчык, дацэнт

# ДЭМАКРАТЫЗАЦЫЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАГА ЖЫЦЦЯ І РЭЦЫДЫВЫ АНТЫСЕМІТЫЗМУ НА БЕЛАРУСІ (ВЯСНА – ВОСЕНЬ 1917 Г.)

The article considers the peculiarities of «Jew's Problem» after the victory of the February revolution and also anti-semitizm recurrences in Belarus under the conditions of democratization of the social and political life.

Сучасныя даследчыкі Лютаўскай рэвалюцыі, галоўным чынам расійскія, у асвятленні прычын яе ўзнікнення, характару, рухаючых сіл дасягнулі вялікіх вынікаў. Па сутнасці, далейшая гаворка на гэты конт можа ісці хіба толькі пра рэгіянальныя асаблівасці ўсталявання новага ладу вясной – восенню 1917 г. Разам з тым, на нашу думку, за веліччу падзей, звязаных з Лютым, амаль не праглядаецца рэакцыя на іх з боку тых, хто складаў сацыяльную базу манархіі, мэтаскіравана або бессвядома стрымліваў рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчыя рухі.

Пасля краху самаўладдзя ў практычным ужытку з'явіліся і сталі актыўна пашырацца каштоўнасці грамадзянскай супольнасці, несумяшчальныя з гвалтам, падаўленнем асобы, бескантрольнай уладай дзяржавы і г. д. Між тым, у працэсе ўсталявання дэмакратычнага рэжыму і разам з ім – ідэйнага плюралізму далёка не ўсе існаваўшыя пры царызме грамадскія аб'яднанні маглі скарыстаць спрыяльныя ўмовы для распаўсюджання сваіх поглядаў. Так, на ўсім працягу вясны – восені 1917 г. ні адна з праманархічных арганізацый адкрыта сябе не выявіла. Характэрна, што свае лепшыя патрыятычныя якасці выявіў вышэйшы генералітэт, які палічыў страту манархіі меншай небяспекай для Расіі ў параўнанні з пагрозай грамадзянскай вайны. Тым не менш пад уздзеяннем левых партый, якія ініцыіравалі дэмакратызацыю ўзброеных сіл, генералы і афіцэры так і не пазбавіліся палітычнага недаверу з боку цёмнай салдацкай масы.

Дваранскае саслоўе як апора самаўладдзя ўступіла ў рэвалюцыю моцна дыскрэдытаваным і нават не рабіла спроб ва ўмовах створанай шматпартыйнай сістэмы выказаць прэтэнзію на ўладу. Адзінай, бадай, уплывовай дваранскай (па сацыяльнаму складу) арганізацыяй зрабіўся Саюз зямельных уласнікаў, ды і той менш за ўсё выказваў сваю палітычную накіраванасць. Відавочна, што з адрачэннем «обожаемого» манарха ад трона ад публічнай дзейнасці адракліся і яго нешматлікія адэпты.

Праваслаўная царква таксама мусіла прыстасоўвацца да новых рэалій, тым не менш яе ўплыў працягваў паніжацца. «Закон божы» стаў выдаляцца са школьных праграм. Урачыстыя набажэнствы на чале з вышэйшымі іерархамі царквы, уласцівыя першым дням рэвалюцыі, калі абвяшчаліся царскія Маніфесты і святкаваліся «Дні Свабоды», канчаткова адышлі ў нябыт. Пасля сакавіцкіх набажэнстваў у гонар новай улады роля святароў у грамадска-палітычным жыцці рабілася ўсё больш непрыкметнай Неўзабаве іерархі адчулі патрэбу ў мадэрнізацыі царквы і пераадоленні духоўнага адчужэння паміж сабой і праваслаўным насельніцтвам. У гэтым напрамку рабіліся намаганні па прыцягненні саміх вернікаў да спраў кіравання парафіямі.

Такім чынам, былая палітычная эліта была вымушана саступіць месца новай, якая рэкрутавалася з розных сацыяльных пластоў, не скампраметаваўшых сябе супрацоўніцтвам з самаўладдзем. Мала таго, грамадскае прызнанне набывалі тыя іх прадстаўнікі, хто ў свой час змагаўся з царскім рэжымам або пацярпеў ад яго. Вызначальным фактарам, які абумовіў натуральную перагрупоўку сіл на карысць падаўляючай большасці насельніцтва, стала дзейнасць Часовага ўрада і найперш ажыццяўленне абвешчаных ім дэмакратычных свабод. У выніку да палітычнага жыцця далучыліся практычна ўсе пласты расійскага грамадства, якія атрымалі магчымасць свабодна, з улікам інтарэсаў адзін аднаго вырашаць свае і агульныя праблемы.

Да ліку сацыяльных пластоў, што выявілі найбольшую актыўнасць у грамадска-палітычным жыцці паслярэвалюцыйнага перыяду, варта аднесці нацыянальныя аб'яднанні: ад разрозненых бежанскіх згуртаванняў – да цэлых этнічных супольнасцяў. З крахам самаўладдзя рухнула і «турма народаў», таму ажыццяўленне нацыянальных ідэалаў ва ўмовах складвання новай палітычнай сістэмы ў большасці залежала ад іх саміх. Асабліва выразна гэтыя працэсы адбываліся на нацыянальных ускраінах. Так, на Беларусі літаральна з першых дзён рэвалюцыі ў агульнадэмакратычным руху выявілася актыўнасць беларускіх, польскіх, яўрэйскіх і іншых камітэтаў дапамогі ахвярам вайны, камітэтаў грамадскай бяспекі з нацыянальным прадстаўніцтвам, нарэшце, чыста нацыянальных па складу аб'яднанняў. У далейшым маштабы, глыбіня і вынікі іх дзейнасці ў сілу розных прычын выяўлялі сябе неаднолькава. Натуральна, што найбольш актыўнымі былі тыя з іх, хто меў тэарэтычна абгрунтаваныя праграмы сваёй дзейнасці, практычны вопыт барацьбы за ажыццяўленне сваіх інтарэсаў, шырокую сацыяльную базу, надзейных і моцных саюзнікаў, падтрымку ўладных структур і грамадскай думкі. У гэтым сэнсе беларусы, а дакладней – іх нешматлікая частка, хто ўсведамляў сваю этнічную адметнасць, мелі найменшыя стартавыя магчымасці для ажыццяўлення сваіх ідэалаў. У ліку прычын таго – дэструктыўнае ўздзеянне носьбітаў «заходнерусісцкай», кадэцкай, сацыялістычнай і іншых ідэалогій, і як вынік – панаванне негатыўнай грамадскай думкі адносна самой магчымасці беларусаў «людзьмі звацца».

Польскі рух на Беларусі, нягледзячы на жорсткія рэпрэсіі царызму, застаўся невыкараненым шмат у чым дзякуючы кансалідуючай ролі рэлігіі. У адрозненне ад праваслаўнага святарства служыцелі каталіцкай царквы ніколі не ўяўлялі сябе асобнай кастай, не аддзяляліся ад вернікаў, а з'яўляліся іх духоўнымі і ідэйнымі настаўнікамі. Невыпадкова, што аўтарытэт касцёла, а разам з ім і ўсяго польскага руху пасля перамогі рэвалюцыі і асабліва ў сувязі з перспектывай адраджэння нацыянальнай дзяржавы прыкметна ўзрос. Значную маральную падтрымку яму аказвалі Часовы ўрад, Петраградскі Савет, мясцовыя ўладныя структуры, нават органы «рэвалюцыйнай дэмакратыі». У тых умовах праявы вялікарускага шавінізму адносна імкненняў палякаў да ўласнай дзяржавы былі выначаны на ўсеагульнае асуджэнне. Усведамляючы сваю ўзрослую сілу, у тым ліку на Беларусі, каталікі дамагаліся вяртання сваіх храмаў, ператвораных у праваслаўныя, і аднаўлення зачыненых самаўладдзем епархій. Аднымі з першых палякі паставілі пытанне перад Часовым урадам аб дазволе фарміравання нацыянальных часцей у складзе расійскай арміі і неўзабаве дамагліся яго станоўчага рашэння.

Яшчэ больш моцным, шырокім, шматгранным па формах, дзейсным і выніковым зрабіўся ўдзел яўрэйскага насельніцтва імперыі ва ўсталяванні новага ладу і ажыццяўленні сваіх інтарэсаў. Найперш яны, гэтыя інтарэсы, адбіліся ў яго актыўнасці па прадухіленні пагромных выступленняў (прадстаўніцтва ў камітэтах грамадскай бяспекі, фарміраванне міліцыі, утварэнне Саветаў рабочых дэпутатаў). У далейшым мітынгі, набажэнствы ў сінагогах, калектыўныя допісы яўрэяў у сталічныя ўстановы, акрамя іншага, набывалі характар агульнанароднай падзякі Часоваму ўраду і думскім дзеячам за вызваленне ад прыгнёту і здзеку, якія яны цярпелі ад самаўладдзя. Акрамя таго, усе яўрэі, незалежна ад сацыяльнага стану або палітычных перакананняў, выказвалі рашучасць сваёй практычнай дзейнасцю падтрымаць новы лад. Са свайго боку, у адпаведнасці з абвешчанымі свабодамі новыя органы ўлады, кіраўніцтва дзяржаўных і ведамасных (Усерасійскі Земскі Саюз, Усерасійскі Саюз Гарадоў, Земгар і інш.) устаноў скасоўвалі дыскрымінацыйныя ў дачыненні да яўрэяў абмежаванні па прыёме на працу, бралі на сябе абавязак дапамогі былым палітычным зняволеным і г. д.

Падчас утварэння партыйных, прафесійных, савецкіх (рабочых дэпутатаў), маладзёжных, жаночых і іншых арганізацый менавіта яўрэйскае жыхарства вылучала асноўную большасць ініцыятараў, кіраўнікоў, актывістаў і радавых іх членаў. З прычыны асобай сацыяльнай і нацыянальнай структуры населеных пунктаў Беларусі асноўную ролю

ў грамадска-палітычным жыцці яе гарадоў і мястэчак таксама адыгрывалі яўрэі. Натуральна, што раней, ва ўмовах хістання ўлады, праяў анархічных інстынктаў сялян-абшчыннікаў, гарадскіх люмпенаў манархісты-юдафобы не ўпускалі шанцаў разыграць «яўрэйскую карту» і скіроўвалі «народны гнеў» супраць «хрыстапрадаўцаў». Але ў дадзеным выпадку, калі Часовы ўрад надаваў усім грамадзянам роўныя правы, праваслаўная царква, былыя царскія чыноўнікі, дваранеземцы, інтэлігенты кансерватыўнага погляду (як правіла, з сістэмы «народнай» адукацыі) і маргіналы (дворнікі, чарнарабочыя, люмпены як пагромная сіла) засталіся без ангажэменту. Па сутнасці, ні адна з названых сацыяльных груповак не рызыкнула на гэты раз адкрыта «...спасать Россию». Але іх ідэі і лозунгі не страцілі свой пагромны патэнцыял. З цягам часу іх узялі на ўзбраенне прадстаўнікі дробнага расійскага чыноўніцтва, хто не здолеў рэалізаваць сябе ў палітыцы і апынуўся адсунутым на другі план сілай рэвалюцыйнай творчасці мас, у падаўляючай сваёй большасці – яўрэйскіх рабочых і інтэлігентаў. Спрыяльнае асяроддзе для распаўсюджання антысеміцкіх ідэй і настрояў на Беларусі стваралі рабочыя абарончых прадпрыемстваў, закінутыя вайною з рускіх губерняў, а таксама іх землякісяляне, мабілізаваныя ў войска.

Такім чынам, антысемітызм як ідэалогія манархістаў і шавіністаў сышоў з публічнага ўжытку. Нягледзячы на тое, што яго праявы мелі не палітычны, а бытавы характар, тым не менш і яны выклікалі заклапочанасць дэмакратычных колаў. Наогул, «яўрэйскае пытанне» служыла своеасаблівым індыкатарам настрояў у грамадстве. У новых умовах яно выглядала невыкараненым рудыментам самаўладдзя. «Ганьба XX стагоддзя ўздымаць гаворку аб гэтым пытанні, – казаў у сваёй прамове на красавіцкім з'ездзе салдацкіх і рабочых дэпутатаў Заходняга фронту адзін з лідэраў Петраградскага Савета М. І. Скобелеў. – Ці не адчуваеце сораму, з якім звязана ў Расіі пытанне аб яўрэях. Мяне, рускага, зневажае, калі кажуць: закрывайце універсітэт для яўрэяў, а то займуць усе месцы ў навуцы. Кажуць, што яўрэі на вёсцы выціснуць рускага кулака. Якая розніца, ад каго цярпець абіранні? Старому самаўладдзю было патрэбна яўрэйскае пытанне. Кулакам на вёсцы патрэбна проціпаставіць асвету. Патрэбна адабраць гэты кашмар са Свабоднай Расіі... Мы выдалі дэкрэт аб роўнасці нацыянальнасцяў. Але, відаць, лягчэй было выдаць акт, чым перавярнуць мазгі ў тых, хто няправільна думае. Пастараемся ж, каб раўнапраўе нацыянальнасцяў не было толькі папяровым актам, але і ўвайшло ў жыццё» [1].

У гэтым сэнсе на Беларусі ажыццяўленне яўрэйскага раўнапраўя не сустракала процідзеяння. Як адзначалася вышэй, утварэнне шматлікіх партыйных, савецкіх (рабочых дэпутатаў), прафсаюзных арганізацый з падаўляючай большасцю ў іх яўрэяў, а таксама наяўнасць органаў друку, якія імі (яўрэямі) рэдагаваліся, і іншыя факты забяспечвалі станоўчую грамадскую думку адносна «яўрэйскага пытання». Так, паводле паведамлення ўрадавай губернскай газеты, 3 красавіка падчас мітынгу ў Дукоры адзін з прамоўцаў-салдат быццам паспрабаваў узняць голас супраць яўрэяў, «дык самі ж сяляне папрасілі яго вызваліць трыбуну і не далі яму выказацца да канца» [2].

На справе антыяўрэйскія настроі ў салдацкай масе былі даволі істотнымі. Так, 24 красавіка Савет салдацкіх дэпутатаў Гарадка пастанавіў пакараць хатнім арыштам на адзін тыдзень А. П. Шырачэнку «за пагромную агітацыю супраць яўрэяў» [3]. Пастаянная трывожная атмасфера сярод яўрэйскага насельніцтва існавала там, дзе адбываліся частыя змены часцей гарнізонаў, з якімі мясцовыя грамадскія арганізацыі не мелі магчымасці ўсталяваць трывалыя кантакты. Як правіла, такое становішча існавала ў Віцебску, Гомелі, Рэчыцы, Жлобіне, Калінкавічах, на іншых чыгуначных вузлах. Так, у маі выканкам Гомельскага Савета ў поўным кантакце з ваеннай секцыяй узялі на сябе працу па заспакаенні мясцовага насельніцтва ў сувязі з распаўсюджаннем чутак аб чарнасотніцкіх падкопах. З гэтай нагоды адбыліся вобыскі ў асоб, якія падазраваліся ў такога кшталту дзейнасці. Пасля дамоўленасці выканкама з камандаваннем 17 мая некалькі эскадронаў драгунаў пад чырвоным сцягам з надпісам «Далоў чорную сотню. Далоў пагромы» прае-

халі па вуліцах горада. Мітынг, арганізаваны вайскоўцамі, быў скіраваны на ўмацаванне кантактаў гарнізона з працоўнымі горада [4].

Другім сродкам барацьбы з антысемітызмам з'яўлялася судовае праследаванне саміх юдафобаў. Натуральна, што пад «агнём» апынуліся прадстаўнікі былых праманархісцкіх арганізацый, а таксама асобныя служыцелі хрысціянскіх прыходаў. Так, у антыяўрэйскай агітацыі быў абвінавачаны заслаўскі святар [5], а таксама служыцель Ільінскай царквы Е. Загадскі за «расклейку пракламацый, заклікаўшых да пагрому» [6]. У маі, паводле газетнай нататкі, у Слуцкім павеце назіралася «пагромная агітацыя супраць яўрэяў і дэмакратыі». У выніку вобыску ў манастыры былі знойдзены 5000 экземпляраў брашур пагромнага зместу [7]. Высветлілася таксама, што пагромная літаратура выдавалася ў друкарні, якая належала былому старшыні Мінскага аддзела «Саюза Міхаіла Архангела» Некрасаву [8]. У самім Мінску 14 мая на некаторых вуліцах былі раскіданы лісткі з надрукаваным на машынцы заклікам «Бі жыдоў» [9]. У ноч на 1 чэрвеня ў Мазыры былі расклеены адозвы за подпісам Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў з заклікам да пагрому [10]. Не выключана, што гэта правакацыя магла быць інспіравана «Руска-славянскім яднаннем» [11].

Адным са сродкаў барацьбы з юдафобамі была іх высылка за межы тых населеных пунктаў, дзе яны пражывалі. Так, на пачатку ліпеня па патрабаванні Слуцкага Савета настаяцель манастыра айцец Афанасій «як зацяты і непрымірымы праціўнік новага ладу» быў высланы ўладамі за межы Мінскай губерні [7]. За падобную дзейнасць з Рэчыцы быў высланы выкладчык мясцовай гімназіі С. А. Кавалік. 15 ліпеня за яго перад павятовымі ўладамі сталі хадайнічаць члены мясцовага Саюза гараджан на чале з судовым следчым Свістун-Дудзінскім. Прычым дэлегацыя з выпадку адмовы пагражала пагромам з удзелам салдат палка, які нядаўна размясціўся ў горадзе [12]. Са свайго боку, палкавы камітэт запэўніў грамадскасць у падтрымцы дэмакратыі і парадку.

Дзенідзе пагромшчыкі ад слоў пераходзілі да справы. У шэрагу зафіксаваных пажараў, што адбываліся ў маі ў Віцебску, было заўважана, што «падпальваліся выключна яўрэйскія будынкі. Там жа знаходзіліся друкаваныя пракламацыі пагромнага зместу» [13]. У рапарце пракурора Петраградскай судовай палаты на адрас міністра юстыцыі зазначалася, што «заклікі да яўрэйскага пагрому часцей за ўсё раздаюцца ў Віцебску і Петраградзе, дзе пагромшчыкі ў прамовах указваюць на яўрэйскае засілле ў міліцыі, Савеце рабочых дэпутатаў і раённых думах» [14].

Не была пераадолена і такая характэрная рыса ў праяве антысемітызму, як імкненне абвінаваціць яўрэяў у цяжкасцях перажываемага часу і нават выпадковых здарэннях. Што да апошняга, то пасля крушэння 6 ліпеня пад Полацкам эшалона, у якім ехаў Керанскі, у горадзе і яго наваколлях распаўсюдзіліся пракламацыі з заклікам да расправы з яўрэямі, быццам рыхтаваўшымі замах на кіраўніка Часовага ўрада [15]. Былі выпадкі менш дробныя, але і яны пагражалі мясцовым яўрэям буйнымі непрыемнасцямі. Так, калі ў Магілёве ў сям'і палкоўніка знік трохгадовы хлопчык, па гораду «сталі распаўсюджвацца чуткі аб рытуальным забойстве і раздавацца заклікі да пагрому». Канфлікт быў вырашаны пасля выяўлення сведкаў інцыдэнту [16], тым не менш знаходжанне вайскоўцаў у гэтым горадзе абумоўлівала пастаянны неспакой яўрэйскага жыхарства.

У час абвастрэння палітычнай сітуацыі нават прыналежнасць яўрэяў-рабочых да «рэвалюцыйнай дэмакратыі» не давала ім імунітэту ад юдафобскіх падкопаў. У гэтым сэнсе цяжка было абысціся без інцыдэнтаў падчас перадвыбарнай кампаніі ў мясцовыя самакіраванні, калі яўрэйскае насельніцтва ўпершыню паспрабавала выкарыстаць сваё дэмакратычнае права абіраць і быць абранымі. Натуральна, што яго актыўнасць у гэтым напрамку не магла не выклікаць насцярожанасці або нават звычайнага раздражнення з боку іншых жыхароў. Так, у Магілёве ў адказ на заклік салдата-агітатара галасаваць за спіс сацыялістычнага блока адна жыхарка, малочніца, заявіла: «Цара знішчылі, краіну разбурылі, а цяпер хочаце ўсё жыдам аддаць?...За першы спіс агітуеце? А там усе жыды ды жыды, ніводнага селяніна. А калі ты нам сябар, то раіў бы даваць галасы за партыю, што

без яўрэяў» [17].

У Мсціслаўлі ў час выбарчай кампаніі з 18 спісаў 17 былі складзены па нацыянальнай прыкмеце – яўрэі і рускія [18]. «Першае, што кідаецца ў вочы, – пісаў з гэтай нагоды газетны аглядальнік, – гэта дрэнна схаваная варожасць паміж яўрэямі і неяўрэямі. Навошта гэты падзел на два лагеры? Ці не лепш працаваць разам?» [19]. Быў выпадак, калі па запрашэнні халопеніцкага «Камітэта аб'яднаных сацыялістаў» у мястэчка прыехаў член Барысаўскага Савета бундавец Д. Розенблюм і выступіў з дакладам аб бягучым моманце, асобныя «ісцінна рускія грамадзяне» Поляк, Лапаткін і іншыя ўбачылі ў прамове «здраду і правакацыю». У выніку аратар быў арыштаваны і вызвалены толькі прыбыўшымі з Барысава таварышамі [20].

Пры гэтым часам наўмысна або па неспрактыкаванасці грубыя памылкі такога ж кшталту дапускаліся прадстаўнікамі самой «рэвалюцыйнай дэмакратыі», якім у сілу перакананняў і абавязкаў было наканавана ўмацоўваць новы палітычны лад. Так, у ліпені шклоўскі валасны камітэт пры раздачы пайкоў салдаткам пастанавіў патрабаваць выключна ад жанчын-яўрэек пасведчанні аб тым, што іх мужы сапраўды на вайсковай службе. А ў самім Шклове член харчовай управы Шарай з атрадам салдат учыніў вобыск у сінагозе падчас набажэнства. «Няўжо Савет не прадпрыме такіх захадаў, – пісаў у газету абураны жыхар, – якія ў корані знішчылі б усялякія спробы сеяць рознь паміж нацыянальнасцямі, якія насяляюць Расію?» [21]. У дваццатых чыслах верасня на пасяджэнні Мінскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў адзін з яго членаў накіраваў у прэзідыум запіску, дзе гаварылася: «Няхай яўрэі не хаваюць муку і цукар, тады не будзе пагрому...» [22]. Нягледзячы на тое, што аўтара яе знайсці не ўдалося, а выпадак з ёй расцэнены як «пагромная выхадка», гэта, акрамя іншага, сведчыла: антысеміцкія настроі працягвалі існаваць і ў асяроддзі «рэвалюцыйнай дэмакратыі».

Зрэшты, усе выяўленыя рэцыдывы антысемітызму падлягалі пільнаму разгляду органаў дзяржаўнай улады і «рэвалюцыйнай дэмакратыі». Характэрна, што на этапе фарміравання дэмакратычных інстытутаў гэтая праблема лічылася самым сур'ёзным рудыментам старога рэжыму. Так, 24 ліпеня на губернскім з'ездзе Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў Магілёўшчыны адзначалася, што «контррэвалюцыйная дзейнасць тут, на месцах, выяўляецца ў антысемітызме, які развіваецца, і ў цкаванні яўрэяў» [23].

Відавочна, што іншая контррэвалюцыйная дзейнасць, па класавых мерках – буржуазная або памешчыцкая, калі нават яна і існавала, не выклікала істотнага непакою з боку «рэвалюцыйнай дэмакратыі». Умацаванне органаў дзяржаўнай і мясцовай улады, здавалася, гарантавала бесканфліктнае ажыццяўленне патрэб усіх пластоў насельніцтва. Іншая справа, што нестабільнасць улады пры нарастанні крызісных з'яў у эканоміцы і палітыцы краіны стымулявала грамадскасць да пошуку шляхоў іх вырашэння, але ў розных напрамках. «Рэвалюцыйная дэмакратыя» разам з Часовым урадам губляла аўтарытэт у насельніцтва і з пачатку Лютага нічога новага прапанаваць не магла. Бальшавікі амаль адкрыта рыхтавалі ўзброенае паўстанне. У тых умовах ментальнасць сярэднестатыстычнага абываценя хрысціянскага веравызнання адносна прычын пагаршэння становішча Расіі заставалася неадрыўнай ад юдафобіі. Тым не менш з разрастаннем бальшавізму і анархіі на фронце менавіта салдаты сталі ўяўляць асноўную пагрозу яўрэйскаму насельніцтву. Так, крызіс улады, выкліканы канфліктам Керанскага з Карнілавым, абвастрыў не толькі палітычную сітуацыю. Характэрна, што сам мяцежны генерал у сваіх адозвах не выказваў ніякіх антыяўрэйскіх настрояў, але жыхары Магілёва, Бабруйска, іншых гарадоў перажылі трывожныя дні. У Жлобіне пачалася «моцная антыяўрэйская агітацыя» [24]. У Мінску пачалося фарміраванне атрадаў яўрэйскай самаахоўы, а следам з'явіліся пракламацыі з заклікам да яўрэйскіх пагромаў [25].

Па меры актывізацыі бальшавікоў на фронце і ў тыле пагроза яўрэйскаму жыхарству з боку салдат і дэкласіраваных элементаў стала набываць рэальныя абрысы. Абуджэнне пагромных настрояў, акрамя іншага, сведчыла аб невысокім узроўні палітычнай асветы

найперш салдацкіх мас. Менавіта ў іх асяроддзі гэтыя настроі ўзнікалі, выспявалі і развіваліся. Яны ўяўлялі сабою частку агульнага разлажэння ўзброеных сіл наогул. Паводле паведамлення выконваючага абавязкі ваеннага камісара Майсеенкі на адрас Керанскага ад 11 кастрычніка, на глебе разлажэння ў раёне дыслакацыі II арміі – Цімкавічы, Нясвіж, Клецк і інш. «мае поспех антысеміцкая прапаганда» [26].

У Віцебску, каб збіць хвалю нарастаўшай трывогі, давялося стварыць антыпагромны камітэт. Аб узраставшай «нацыянальнай розні» ў Крычаве, Прапойску, Клімавічах паведамляў агітатар з Гомеля [27]. Магчымасць пагрому ў Мінску і Бабруйску звязвалася з абвешчаным выступленнем бальшавікоў сталіцы падчас склікання II з'езда Саветаў. Нарэшце, 23 і 25 кастрычніка сіламі вайскоўцаў пачаліся пагромы ў Рэчыцы і Глыбокім [28], а з усталяваннем Савецкай улады і развалам фронту яны набылі перманентны характар і не перапыняліся аж да германскай акупацыі Беларусі ў канцы лютага 1918 г. [29].

Такім чынам, ажыццяўленне практычных захадаў па рэфармаванні сістэмы органаў дзяржаўнага і мясцовага кіравання, дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця ў краіне і г. д. было яўна недастаткова для таго, каб забяспечыць рэальнае раўнапраўе ўсіх грамадзян Расіі. Па-ранейшаму яўрэйская іх частка адчувала маральна-псіхалагічны, а часам і фізічны ўціск з боку праманархічных і шавіністычных элементаў. Для Беларусі характэрным было тое, што антысемітызм як зброя рэакцыйных пластоў у барацьбе супраць рэвалюцыі ў новых умовах страціў сваю палітычную накіраванасць, а ўвасобіўся галоўным чынам у лакальных рэцыдывах бытавой юдафобіі. Каталізатарам павелічэння і пашырэння іх выпадкаў з'яўлялася пагаршэнне пераважна эканамічнага становішча ў краіне, звязанае з вайной. Пад уздзеяннем адкрытых і латэнтных адэптаў манархіі ажывала абывацельскае перакананне хрысціянскага насельніцтва, што ва ўсіх яго цяжкасцях вінаваты яўрэі. Яшчэ менш палітызаваным быў антысемітызм вайскоўцаў, мабілізаваных з сялян, як правіла, з унутраных губерняў Расіі, частка якіх, нягледзячы на намаганні лідэраў «рэвалюцыйнай дэмакратыі», бачылі ў яўрэйстве сродак для задавальнення сваіх ганебных інтарэсаў (гвалт, рабаўніцтва чужой маёмасці, здзек над безабароннымі людзьмі і г. д.). Узрастанне анархічных працэсаў на фронце і ў тыле зрабілася для яўрэйскага насельніцтва больш сур'ёзным фактарам, чым дзейнасць праманархісцкіх або былых чарнасоценскіх элементаў.

## ЛІТАРАТУРА


1. Минский голос. 1917. 9 апреля; Речь. 1917. 11 апреля.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 60. В. 3. С. 242. Л. 77.
3. НАРБ. Ф. 60. В. 3. С. 242. Л. 120.
4. Известия Гомельского Совета. 1917. 18 мая.
5. НАРБ. Ф. 60. В. 3. С. 242. Л. 211.
6. Известия Витебского Совета. 1917. 19 октября.
7. НАРБ. Ф. 60. В. 3. С. 161. Л. 18/19.
8. Новое Варшавское утро. 1917. 2 июля.
9. Новое Варшавское утро. 1917. 16 мая.
10. Известия Мозырского Совета. 1917. 2 июня.
11. Фронт. 1917. 6 июня.
12. Известия Гомельского Совета. 1917. 20 июля.
13. НАРБ. Ф. 60. В. 3. С. 242. Л. 164.
14. Рабочая мысль. 1917. 5 июля.
15. Воля народа. 1917. 19 июля.
16. Народное слово. 1917. 23 сентября.
17. Молот. 1917. 14 августа.
18. Мстиславский голос. 1917. 6 августа.

19. Мстиславский голос. 1917. 27 августа.
20. Минская газета. 1917. 11 августа.
21. Оршанский вестник. 1917. 12 сентября.
22. Новое Варшавское утро. 1917. 29 сентября.
23. Молот. 1917. 27 июля.
24. Молот. 1917. 7 сентября.
25. Минская газета. 1917. 3 сентября.
26. НАРБ. Ф. 60. В. 3. С. 243. Л. 403.
27. Рабочая мысль. 1917. 22 октября.
28. Витебское слово. 1917. 15 октября; Витебский листок. 1917. 18 октября; Бобруйский курьер. 1917. 20 октября; Минская газета. 1917. 20, 26 октября.
29. Сяменчык М. Я. Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі ў перыяд Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый (сакавік 1917 – сакавік 1918 г.): У 2 ч. Мн.: БДПУ імя Максіма Танка, 2001. Ч. II. Грамадска-палітычнае жыццё ва ўмовах складвання таталітарнага рэжыму. 160 с.